**7 студзеня 2025 г. - 80 гадоў з дня нараджэння Антона Сцяпанавіча Ткачука (1945-2015), ветэрана сельскагаспадарчай вытворчасці, першага кіраўніка саўгаса «Днепра-Бугскі» Кобрынскага раёна**



Антон Сцяпанавіч Ткачук нарадзіўся 7 студзеня 1945 года ў в. Жыдче Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. Маці Ганна Еўдакімаўна і бацька Сцяпан Іванавіч працавалі паляводамі ў калгасе імя Свярдлова. Рана да сялянскай працы прывык і Антон. Сцяпан Іванавіч — былы франтавік, любіў ваенныя песні, часта сам спяваў іх, гэтую улюбёнасць перадаў і сыну. Калі Антону споўнілася пяць гадоў, бацька купіў яму гармонь. Музыка хлопцу давалася лёгка, у дзесяць гадоў яго ўжо запрашалі іграць на танцах. Вучыўся Антон у Хойніцкай сярэдняй школе Пінскага раёна, да якой прыходзілася дабірацца восенню і вясной на веласіпедзе, а зімою – на лыжах.

Сваю працоўную дзейнасць Антон Ткачук пачаў у ліпені 1961 года загадчыкам сельскім клубам у в. Хойна. Пасля школы паступіў ў Пінскі мяса-малочны тэхнікум. Аднак праз год вучобы зразумеў, што гэта не яго прызванне, і ў 1962 годзе паступіў у Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, які закончыў у 1968 годзе па спецыяльнасці «інжынер-механік».

З ліпеня 1968 года па ліпень 1970 года працаваў загадчыкам рамонтнымі майстэрнямі аддзялення «Сельгас-тэхніка» ў в. Дзівін Кобрынскага раёна. Добрае веданне справы, добразычлівыя адносіны да рабочых вызначылі аўтарытэт маладога спецыяліста. Потым маладому камуністу давяраюць пасаду галоўнага інжынера, а яшчэ праз некаторы час Антона Сцяпанавіча выбіраюць сакратаром партарга-нізацыі.

У 1973-1974 гадах А. С. Ткачук - намеснік старшыні калгаса «Новае жыццё» Кобрынскага раёна. З сакавіка 1974-га па люты 1981 года працаваў старшынёй калгаса імя Кірава Кобрынскага раёна. Гэта было сур’ёзнае выпрабаванне яго кіраўніцкіх і арганізатарскіх здольнасцей, якое Антон Сцяпанавіч дастойна вытрымаў. У калгасе імя Кірава ён атрымаў свой першы ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

16 гадоў, з лютага 1981 года па люты 1997 года, узначальваў саўгас «Днепра-Бугскі» (цяпер ААТ «Днепра-Бугскае»), які быў арганізаваны ў пабудаваным у 1980 годзе пасёлку гарадскога тыпу Арэхаўскі. Ужо за першае дзесяцігоддзе свайго існавання саўгас ператварыўся ў высокарэнтабельнае, магутнае сельскагаспадарчае прадпрыемства са стабільнай эканомікай і вялікімі грашовымі прыбыткамі. Гаспадарка не толькі грымела сваімі поспехамі на ўсю Беларусь, але і была вядома далёка за яе межамі. Убачыць пасёлак, які вырас сярод балот на меліяраваных землях, прыязджалі дэлегацыі з усяго былога Савецкага Саюза.

Граматны арганізатар і ініцыятыўны кіраўнік сельскагаспадарчай вытворчасці, А. С. Ткачук заўсёды праяўляў ініцыятыву і настойлівасць у вырашэнні вытворчых пытанняў. Новыя планы, задумкі ён імкнуўся ператварыць у жыццё. У саўгасе стварылі сваю каняферму, у 1988 годзе завезлі плямістых аленяў і арганізавалі сваю звераферму - першую ў Беларусі. Антону Сцяпанавічу былі ўласцівыя высокі прафесіяналізм, кампетэнтнасць і адказнасць за даручаную справу. Ён унікаў ва ўсё: міма яго ўвагі не прайшлі і пытанні будаўніцтва жылля і аб'ектаў сацыяльнага прызначэння. На працягу шасці гадоў, з ліпеня 1997 года па сакавік 2003 года, Антон Сцяпанавіч працаваў старшынёй Дзівінскага сельскага Савета дэпутатаў.

За шматгадовую і добрасумленную працу А. С. Ткачук быў узнагароджаны медалём «За доблестный труд» (1976), двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1976, 1986), неаднаразова адзначаны падзячнымі лістамі, ганаровымі граматамі.

9 чэрвеня 2015 года на 71-м годзе жыцця ў выніку цяжкай хваробы Антон Сцяпанавіч Ткачук памёр.

Жыццёвы шлях А. С. Ткачука, яго адданасць справе выклікаюць бясконцую павагу і вартыя асаблівай падзякі землякоў. Ён стаяў ля вытокаў будаўніцтва пасёлка і стаў першым кіраўніком створанага ў Арэхаўскім саўгаса «Днепра-Бугскі». У студзені 2016 года ў пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі Антону Ткачуку, якая будзе нагадваць аб чалавеку, чыё імя годна застацца ў памяці пакаленняў.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Савчук, В. Л.** «Днепро-Бугское» / В. Л. Савчук // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. - Минск, 2009. - Т. 1, кн. 1. - С. 328–329.

**Арэхаўскі** : [Кобрынскі раён] // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4. - С. 118.

**Лукашик, П. И.** Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с.

См. на с. 29-30.

**Ткачук, А.** По пути специализации / А. Ткачук // АПК: курсом ускорения. - Минск, 1988. - С. 85–86.

**Ткачук Антон Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 77-78 : фат.

**80 гадоў** з дня нараджэння А. С. Ткачука (1945-2015) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 183.

**Казакова, А.** Любви народной достоин / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. — 14 января. — С. 4.

О А. С. Ткачуке, первом руководителе созданного в пос. Ореховском совхозе "Днепро-Бугский" и открытии в честь его мемориальной доски.

**Пашковіч, Л.** Добрая праца не забываецца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 9 студзеня. - С. 1.

У пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса "Днепра-Бугскі" Антона Ткачука.

**Ткачук Антон Степанович** : некролог // Кобрынскі веснік. – 2015. – 13 чэрвеня. – С. 12.

**Пятроўская, М.** Свята пасёлка і яго жыхароў / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 1994. – 17 верасня. – С. 3.

Аб свяце пас. Арэхаўскі ў саўгасе «Днепра-Бугскі».

**Знаёмцеся**: саўгас «Днепра-Бугскі» // Кобрынскі веснік. – 1992. – 11 лістапада. – С. 3.

Са дня стварэння саўгаса «Днепра-Бугскі» яго ўзначальвае ініцыятыўны дырэктар - Антон Сцяпанавіч Ткачук.

**Ткачук, А.** На ўрад спадзявайся, але і сам старайся : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Кобрынскі веснік. - 1992. - 11 лістапада.

**Саўгас** «Днепра-Бугскі» : радкі біяграфіі // Кобрынскі веснік. – 1991. - № 20. – С. 1.

Антон Сцяпанавіч Ткачук узначаліў створаны новы саўгас «Днепра-Бугскі».

**Ткачук, А**. Ці ўсе рэзервы задзейнічаны? / Антон Ткачук // Камуністычная праца. – 1990. – 12 чэрвеня.

**Лебедзеў, Г.** Час Антона Ткачука / Г. Лебедзеў // Звязда. – 1989. – 3 студзеня.

Пра дырэктара саўгаса «Днепра-Бугскі» А. Ткачука.

**Дрымук, В.** Наш дэвіз – творчасць : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / В. Дрымук // Камуністычная праца. – 1988. – 4 студзеня.

**Сацук, А.** І вечны бой… / А. Сацук // Камуністычная праца. – 1988. – 21 красавіка.

Пра Антона Сцяпанавіча Ткачука – дырэктара саўгаса «Днепра-Бугскі».

**Ткачук, А.** Гарантируем большое молоко / А. Ткачук // Сельская газета. – 1987. – 15 июля.

Директор А. Ткачук об опыте совхоза «Днепро-Бугский» Кобринского района

**Ткачук, А.** Землю не обманешь : [совхоз «Днепро-Бугский»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. - 1986. – 28 января.

**Ткачук, А.** З дзяржаўных пазіцый : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. - Кобрын, 1986. - 3 красавіка.

**Ткачук, А.** Бачыць перспектыву : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. - Кобрын, 1985. – 23 сакавіка.

**Ткачук, А.** На подъеме : [рассказывает директор совхоза «Днепро-Бугский» Кобринского района] / А. Ткачук // Сельское хозяйство Белоруссии. - 1985. - № 1. - С. 14–15.

**Писарев, Н.** Начало биографии : [пос. Днепро-Бугский] / Н. Писарев // Заря. – 1884. – 3 февраля.

**Ткачук, А.** Саўгас набірае сілу : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Звязда на меліярацыі Палесся. - 1982. – 16 снежня.

**Ткачук, А.** Дарогай станаўлення : [саўгас «Днепра-Бугскі»] / А. Ткачук // Камуністычная праца. - Кобрын, 1982. – 27 лістапада.

**Елец, П.** Растёт посёлок у Днепра-Буга : [Кобринский район] / П. Елец // Заря. – 1982. – 28 мая.

**Ткачук, А.** Возьмем вызначаныя рубяжы / А. Ткачук // Камуністычная праца. - Кобрын, 1980. - 31 ліпеня.

Артыкул старшыні калгаса імя Кірава.

***Рэгіён:***

Пінскі раён
Жыдча
Кобрынскі раён
Арэхаўскі

***Імёны:***

Ткачук Антон Сцяпанавіч

***Установы:***

Саўгас «Днепра-Бугскі»

***Прадметы:***

Саўгасы